УДК 82-1(476)

# ІДЭЙНА-ЭСТЭТЫЧНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ПАЭЗІІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

***В. С. Войценка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***М. І. Чмарава***,
канд. філал. навук, дацэнт

Рыгор Барадулін вельмі самабытны і арыгінальны паэт. Арыгінальны тым, што ён непадобны да іншых паэтаў. На індывідуальнасць паэта робіць уплыў «сілавое поле» і народнай паэзіі, класікі, і мастацкі вопыт усёй эпохі. Разам з тым, менавіта свой асабісты стыль робіць кожнага мастака своеасаблівым і адметным [1, с. 8]. Тэма Бацькаўшчыны, маці, роднай мовы, хрысціянскай маралі заўседы былі найбольш важнымі для паэта. У першым зборніку «Маладзік над стэпам» паэт паказвае, што ён у стане адкрываць эстэтычную каштоўнасць самай простай бытавой дэталі, закрануць падрабязнасці, розныя бакі біяграфіі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лірычнага героя. У другім зборніку «Рунець, красавасць, наліваецца!» аўтар заўважна пасталеў. Самым выбітным вершам гэтага зборніку з'яўляецца «Трэба дома бываць часцей». «Нагбом» – трэцяя кніга Р. Барадуліна. І. Шклярэўскі ў адным з артыкулаў пра Барадуліна тлумачыў: "Нагбом" – гэта калі бярэш у рукі заледзянелае вядро і п'еш з яго, здзьмухваючы звонкія ільдзінкі і леташняе лісце» [2, с. 59]. Родная мова, яе лес і будучыня – адна з самых хвалюючых тэм на працягу ўсёй творчасці Рыгора Барадуліна. Верш «Мая мова» пацвярджэнне таму, што Барадулін быў сапраўдным патрыётам сваёй краіны.

Р. Барадулін увайшоў у мастацкую літаратуру ў пасляваенны час. На творчасці паэта выразна адбілася свежая і горкая памяць аб дзяцінстве, аб гераізме, моцы і вытрымцы змагароў, барацьбітоў за Радзіму. Вайна – самая страшная падзея, якая можа быць на Зямлі. Менавіта верш «Бацьку», радкі якога кранаюць да слез, не пакідае раўнадушным кожнага чалавека.

Такім чынам, праз уласную творчасць паэт будуе свой свет, зnative з вытокамі свайго роду, сваёй зямлі, свайго народа – у гэтым яго асаблівасць і непаўторнасць, індывідуальная самабытнасць і арыгінальнасць. Прырода мастацкага мыслення Р. Барадуліна – нацыянальная. Яго метафара грунтуецца на моўнапаэтычным вопыце народнага слова, уяўленні яго эстэтычнай і фальклорнай традыцыі.

**Літаратура**

1. **Астраух, А. Э.** Рыгор Барадулін і сучасная беларуская лірыка: вучэб.-метад. дапам. / А. Э. Астраух. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 121 с.

2. **Гніламёдаў, У.** Ля аднаго вогнішча: літаратурна-крытычныя артыкулы: [для старэйшага школьнага ўзросту] / У. Гніламедаў. – Мінск : Юнацтва, 1984. – 188 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова